Клопат

ЛЕКІ АД АДЗІНОТЫ

З маленства нас вучаць паважаць старэйшых: саступаць ім месца ў транспарце, дапамагаць пераходзіць вуліцу, шанаваць у сям'і. Але ж тады, у раннім дзяцінстве, важнасць гэтых павучанняў не вельмі і разумееш.

Маёй бабулі ўжо за 90. Падчас вайны яе выслалі ў фашысцкую Германію. Там яна працавала ў сям'і нямецкага афіцэра і нават праз столькі гадоў не можа забыць, як аднойчы разбіла талерку і як гаспадыня потым біла яе. «Дагэтуль баліць», — гаворыць бабуля.

Цяпер я разумею, што ёй давялося перажыць, і стараюся зрабіць усё магчымае, каб дапамагчы ёй: прыязджаю, абдымаю, засумаваўшы, часта тэлефаную, каб даведацца, як яе справы, здароўе? І па голасе чую тады, што мая бабуля робіцца шчаслівай. А што ж чужыя?

У нашай школе сёлета праводзіцца акцыя «Дом без адзіноты!». Для таго каб яе і сапраўды не было, вучні з ахвотай наведваюць жыхароў аграгарадка Путрышкі. Дзяўчаты дапамагаюць прыбіраць у дамах, хлопцы купляюць прадукты, усе разам працуюць у агародах.

Пажылыя людзі ветліва сустракаюць дзяцей, запрашаюць у хату, у цёплай, быццам сямейнай, абстаноўцы расказваюць пра сваё жыццё. І пачуць тады можна рознае: як атрымалі раненні, як жылі пасля вайны, як працавалі, як страцілі родных і блізкіх...

Але ж, відаць, не ўсіх, калі прыходзяць дзеці? Няхай і не свае.

Вераніка ВАЛЧКЕВІЧ,
настаўніца
Путрышкаўскай сярэдняй школы,
Гродзенскі раён.

Сам-насам з усімі

«...ГЭТА НАША ЗЯМЛЯ!

Ад бацькоў мы прынялі яе жывой і дагледжанай, а вось якой перададзім — яшчэ пытанне»

...Нехта недурны прызнаў: «Калі ты кульгаваму скажаш, што ён кульгавы, то, вядома ж, не падманеш, але навошта яму твая праўда?»
Вось і мы, паўтарыўшы паэтава «Письма пишут разные: // Слезные, болезные, // Иногда прекрасные, // Чаще бесполезные», рызыкуем паведаміць ужо вядомае, і калі спрэчнае, то хіба ў апошнім радку, бо ў трох першых — чыстая праўда.
А зрэшты і як заўжды, мяркуйце самі (лісты друкуюцца ў пераказе) і па парадку: такім чынам — слёзныя.

«У чэрвені 2015 да мяне прыехала старэйшая сястра Валянціна, якая жыве ў Расі», — піша **спадар Р. са Слуцка.** — *Разам з ёй і нашым пляменнікам мы з'ездзілі ў вёску на так званую малую радзіму, і сястра яе проста не пазнала. Са слязамі на вачах пыталася: «Куды вы мяне прывезлі?»*

З 15 дамоў у той вёсцы застаўся толькі адзін, уздоўж вуліцы сухія старыя дрэвы, разбураныя хаты. Заліўны поплаў абапал рэчышча некалі зааралі і тым самым знішчылі крыніцы, услед за імі — рэчку. Гэта некалі над ёй быў вялікі драўляны мост, а ўжо колькі ўсялякай рыбы! Мы, малыя, лавілі яе звычайнымі кашамі...

Хапала там і слімакоў, апалонікаў, жаб, камароў, іншай жыўнасці — птушкам было раздолле. А цяпер яны ператварыліся ў вегетарыянцаў і клююць нашы вішні...

Знішчыў чалавек вельмі шмат што, — канстатуе спадар Р., — *і працягвае, знішчаючы тым самым сябе...*

У той дзень мы з сястрой успаміналі многае: як напрадвесні збіралі на калгасным полі мерзлую бульбу, як бегалі на поплаў па зелле, як нас ганяў кульгавы паплаўнічы па прозвішчы Плахіцкі...

З вялікай павагай і заўжды, — працягвае спадар Р., — *успамінаем нашу бабулю Марыну, якой я, можна сказаць, абавязаны жыццём, бо нарадзіўся вельмі кволы, з вялікім гнайніком на грудзях. Мясцовы фельчар прызнаў, што я не жылец, а бабуля распарыла цыбуліну, прылажыла яе на больку. Раніцай скулу прарвала, я застаўся жыць. Праўда, вельмі часта хварэў. Таму бабуля карову падоіць і да мяне: выпі сырадою. Помню яго смак і тое, які ж духмяны хлеб на кляновых лістах пёкся ў нашай печы...*

Усяго гэтага ўжо няма, як няма і самой вёскі. Хто вінаваты? Аўтар (і не толькі гэтага ліста) перакананы: не ён, не яго сястра, не сябры ці аднакласнікі... Вінаваты мясцовыя ўлады, і іх трэба прыцягнуць да адказнасці.

Гэтая выснова міжволі нагадвае мне адну сустрэчу — ужо з сучаснымі вясковымі дзецьмі. Усе яны пасля школы збіраліся, што называецца, у вырай: некуды ехаць, паступаць, шукаць працу — абавязкова ў горадзе, пажадана вялікім... Спыталі: «А што ж будзе тут, у вашай вёсцы?»

За ўсіх адказаў самы бойкі: «А сюды нехта іншы прыедзе...»

Так, яны, іншыя, вядома ж, прыязджалі, прыязджаюць і будуць прыязджаць, кіравалі, кіруюць і будуць кіраваць — недзе добра, недзе... Як той казаў, не страляйце ў музыканта, ён іграе як умее...

Таму што нетутэйшы?

А ў тутэйшых ці заўжды хапала (і хапае) смеласці пярэчыць, адстойваць сваё, не жыць па прынцыпе «а можа, так і трэба»?

Ды дзе там... Вось таму і маем, што маем. Што будзем мець?

«Адно з наймацнейшых уражанняў ад апошняй паездкі ў суседнюю Расію, — піша **спадарыня Раіса Станкевіч з Мінска,** — *зарослыя баршчэўнікам палі, узбочыны дарог, узлескі, а месцамі, як выглядае, нават лясы. Страшная гэта расліна! Мала таго, што ядавітая, дык яшчэ і хутка расце, хутка рассяваецца. У нас, у Беларусі, яе таксама шмат, хоць, здаецца, яшчэ не столькі.*

Затое тут наступае іншы «агрэсар». З нашай маўклівай згоды, а часам і з дапамогай імкліва размнажаецца сумнік канадскі. Залюбаваўшыся на жоўтыя кветачкі, кусцікі яго мы садзім у сябе пад вокнамі, каля магіл сваіх родных і не думаем, што, адцвіўшы, ён пакіне багатае насенне, якое не прыжывецца хіба на асфальце.

Але ў агародчыку яго яшчэ можна выкапаць, хоць і цяжка, а вось далей за плотам, за вёскай...

У многіх месцах са звычайнай матыкай або касой з ім ужо не справіцца, але ж хоць трохі прыпыніць гэты працэс можна, калі зжынаць альбо скошваць гэту расліну, а потым спальваць насенне...

Не хацелася б нейкіх гучных фраз, — піша напрыканцы спадарыня Раіса, — *але ж гэта наша зямля! Ад бацькоў мы прынялі яе жывой і дагледжанай, а вось якой перададзім далей — яшчэ пытанне».*

Нехта скажа: не маё, ёсць на гэта ўлады, у тым ліку — мясцовыя.

Так, ёсць. Яны могуць, напрыклад, распрацоўваць праграмы па барацьбе, дабівацца выдзялення сродкаў, закупляць нейкія хімікаты, арганізоўваць суботнікі... Але ж нездарма кажуць: пакуль сонейка ўзыдзе, раса вочы выесць. Ніхто іншы не знішчыць расліну-агрэсара ў вашым кветніку і на вашых могілках. Толькі вы, калі, вядома ж, прыйшлі на гэтую зямлю не госцем, які можа паглядзець, што тут як, ды паехаць назад. А ўжо з якім набыткам...

«Ва ўсіх краінах свету для таго, каб звярнуцца да некага, ёсць неабходныя словы: пан, сэр, сіньёр, міс, мадам і г. д., — чытаем у лісце **спадара Міхаіла Буйніча з Гомеля.** — *А ў нас, у незалежнай Беларусі, часцей за ўсё пачуеш фразы накшталт: «Гэй, мужык...», «Паслухайце, жэншчына!». І гэта пры тым, што вельмі прыгожыя і зручныя звароты — «спадар», «спадарыня» — у нас ёсць. Дык чаму ж мы застаёмся нейкімі безыменнымі?»*

Актуальнае пытанне, хоць, магчыма, і не да нашай газеты, бо «Звязда» яго не раз уздымала. Адзін з артыкулаў, дарэчы, так і называўся — «Спадарыня, дазвольце ёй застацца!» (на сайце альбо ў падшыўках той нумар (за 8.04.2009 года) можна знайсці, як і водгукі, што друкаваліся потым, і, спадзяёмся, паспрыялі таму, што слова гучыць...)

Кажаце, што пакуль нясмела?

Згодны, трэба, каб да «працэсу» вяртання больш актыўна далучаліся радыё, тэлебачанне, а яшчэ лепш, — каб міністэрствы, напрыклад гандлю і транспарту.

Спытаеце, прычым тут яны? А ўявіце, што заўтра ва ўсіх цягніках, аўтобусах, тралейбусах, трамваях ды метро замест — дзякуй богу, беларускага, але ж нейтральнага — «Паважаныя пасажыры» (у крамах «Уважаемые покупатели») па гучнай сувязі загучыць «Шаноўнае спадарства».

Чым гэта лепш?

Тым, што сапраўды па-нашаму, па-беларуску, тым, што стымулюе ўзаемную самапавагу, бо «шаноўныя» — гэта ўжо не проста паважаныя, а паважаныя вельмі, тым, што гэта, так бы мовіць, ператварае пэўную частку насельніцтва ў людзей — у тых жа «мадам» і «месье», «сеньёраў» і «сеньярыт», у «паноў» і «паненак»...

А ў рэшце тым, што проста гучыць прыгажэй, карацей і цікавей, у тым ліку — для гасцей краіны, якія толькі тут, у Беларусі, змогуць пабыць спадарамі і спадарынямі — шаноўным спадарствам.

...Лісты, якія шчыра засмучаюць, узгадваць не хочацца, але ж... «Меня зовут Полина... Я научный сотрудник библиотеки... Прошу опубликовать мои статьи. Заранее благодарю и надеюсь на положительный ответ».

Далей, як і варта чакаць, тэкст артыкула. У першых радках: *«Интерактивность — это взаимодействие, процесс коммуникации, предусматривающий двусторонний диалог между экскурсоводом и экскурсантами, целью которого является преобразование информации в личностные знания...»*

Гэтага — аднаго — сказа, відаць, дастаткова, каб зразумець, што спадарыня Паліна не мае ўяўлення ні пра тое, што такое газета «Звязда», ні пра тое, што яна піша, ні як, якою моваю...

Такі ж папрок можна адрасаваць і шматлікім аўтарам вершаў, напісаных па-руску і, што цікава, у многіх выпадках дасланых па электроннай пошце. Гэта значыць, што аўтары іх, перш чым нешта накіроўваць, маглі — і лёгка — даведацца, што сабой уяўляе газета, ці друкуе яна тыя ж вершы альбо артыкулы з працягам у дзесяці нумарах, ці ёсць шанцы ў «праўдзівай і вясёлай гісторыі», здольнай заняць... цэлую газетную старонку і г. д.

Зрэшты, нават такія лісты, мусіць, грэх назваць «бесполезными», бо яны сведчаць, што імя «Звязды» па-ранейшаму на слыху, што людзі даверяюць газеце. Менавіта таму і яна не злоўжывае даверам: друкуючы лісты, не заўжды, напрыклад, называе прозвішчы аўтараў. Што сутнасці не мяняе. Ці не так?

Так ці не?

ДОБРА, КАЛІ ЁСЦЬ ПРАЦА,

але і без работы — не абысціся

«Калі ласка, растлумачце, чаму «Звязда» піша «сярэбраны», а не «срэбраны», просіць у сваім лісце спадар Леў Дзіханаў. Ён жа хоча даведацца, у чым розніца паміж словамі «спецыяліст» і «адмысловец».
«У адным з выпускаў рубрыкі былі тлумачэнні некаторых назваў жанчын паводле іх адносін да іншых сямейнікаў. А як жа мужчыны? — пытае спадарыня Алена Рыбак. — Хто такі швагер, напрыклад?»

Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць **стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.**

1. Слова *срэбраны* — дапушчальны варыянт. Аднак асноўным, безумоўна, трэба лічыць прыметнік **сярэбраны**.

Рэч у тым, што ён адлюстроўвае адметную рысу нашай мовы — поўнагалоссе. Прыкладаў, калі яно адрозніваецца беларускія словы ад іншых славянскіх, вельмі шмат: ГЛава семьи — ГАЛАва сям'і, ГЛас *(балг., руск.)* — ГОЛАс, KRál *(чэш.)* — КАРОль, SŁodki *(польск.)* — САЛОдкі і г. д. Таму прыметнік «сярэбраны» і трэба выкарыстоўваць у першую чаргу. Тым больш што і слоўнікі падаюць яго як асноўны.

2. Спецыяліст — больш «строгае» слова. Ім трэба называць чалавека, які прафесійна займаецца пэўнай справай і мае для таго адпаведную падрыхтоўку, адукацыю. Напрыклад, скажам *Я не змог адрамантаваць камп'ютар і звярнуўся да спецыяліста* або *Распрацоўкай гэтага зводу правілаў займаліся спецыялісты з галіны філалогіі.*

Адмыслоўцам жа хутчэй называюць сапраўднага майстра, чалавека, які нешта выдатна робіць. Скажам, у «Новай зямлі» ў Якуба Коласа чытаем:

Рыбак быў дзядзька наш Антоні,
Як і работнік, адмысловы.

Такім жа *адмыслоўцам* можна лічыць хірурга, які робіць складаныя аперацыі; каваля, ганчара, пекара і г. д.

3. Адразу прызнаем: назваў мужчын паводле адносін сваяцтва ў нашай мове менш, чым назваў жанчын, але яны ёсць:

шва́гер — гэта па-беларуску і брат жонкі, і муж сястры, і муж швагеркі (жончынай сястры);

дзе́вер — мужаў брат.

У абарону слоў

Усім нам вядомае беларускае слова «праца». *Фізічная праца, прылады працы, акадэмічныя працы* — гэтыя і падобныя словазлучэнні і выразы кожны, хто чытае і гаворыць па-беларуску, сустракае рэгулярна.

Аднак не варта забывацца і пра яшчэ адно беларускае і вельмі патрэбнае слова — «работа». Яно — сваё, ні ў кога не запазычанае. Да таго ж у многіх выпадках яно адзіна магчымае: *будаўнічыя работы; рэчы ручной работы; гэта (ужо) не работа; прымусовыя работы; бегаў Яначка ля плота — якая плата, такая і работа; не столькі работы, колькі турботы* і г. д.

Цікава адзначыць, што ў народзе разам з *працаваць* вельмі пашыраны ў тым жа значэнні і дзеяслоў, аднакарэнны з назоўнікам «работа»: *ён робіць на заводзе ў Мінску, яна робіць кранаўшчыцаю* (прыклады са «Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча»).

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.